КАБ АДПАЧЫНАК БЫЎ БЯСПЕЧНЫМ 4

ПРА СЁННЯШНІ ДЗЕНЬ І ЮБІЛЕІ МУЗЕЯ ЯНКІ КУПАЛЫ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 МАЯ 2024 г. СУБОТА № 96 (30230)

ЦЫТАТА ДНЯ

Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:

«Аб'ём спажывання насельніцтвам электраэнергіі для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння за першы квартал бягучага года склаў 372,4 млн кВт/г, што ў 1,4 раза больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Для задавальнення попыту на электраэнергію ва ўсіх рэгіёнах краіны пашыраюцца будаўніцтва і мадэрнізацыя электрасетак. Працягваецца работа са зваротамі ад грамадзян аб выдачы тэхнічных умоў для выкарыстання электраэнергіі для ацяплення і гарачага водазабеспячэння. У перыяд з 2019-га да першага квартала 2024 года ўсяго паступіла 112 тыс. такіх зваротаў, з іх 89 працэнтаў задаволены. За студзень–сакавік 2024 года — 8,1 тыс., з іх задаволена 92,8 працэнта».

Парадным строем — з адказнасцю і гонарам

Фота Віктара ІВАНЮКОВА.

Беларусь рыхтуецца да святкавання 80-годдзя вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А вяршыня святочных мерапрыемстваў, безумоўна, — ваенны парад. Сімвал любові да Радзімы і гатоўнасці абараняць яе незалежнасць, берагчы мір і спакой.

16 мая на пляцы Мінскай ваеннай камендатуры парадныя разлікі пачалі трэніроўкі па страявой зладжанасці. Для тых, хто пройдзе па вуліцах сталіцы ў парадных «каробках», удзел у парадзе — вялікі гонар і вялікая адказнасць. Права ўдзельнічаць у ім, асабліва ў юбілейны год, кожны вайсковец павінен заслужыць высокімі паказчыкамі ў баявой падрыхтоўцы, быць сапраўдным патрыётам. Адзін з такіх абаронцаў Айчыны — радавы Аляксандр ШТЭРН (на пярэднім плане), які служыць па кантракце ў 11-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгадзе.

КАРАТКА

- ВУП Беларусі ў студзені — красавіку 2024 года вырас на 5,1 працэнта.
- **Мадэль беларускага трактара для паўднёвых краін прадставілі на форуме «Расія —ісламскі свет» у Казані.**
- Мінск 18 мая адкрые музычна-турыстычны сезон.
- **Эндапратэзаванне каленнага сустава асвоілі артапеды Салігорскай цэнтральнай раённай бальніцы.**
- Продаж алкаголю абмяжуюць 25 мая і 14 чэрвеня ў многіх раёнах Беларусі.

ISSN 1990 — 763X

Наталля КАРЧЭЎСКАЯ:

«КУЛЬТУРЫ ПАТРЭБНЫ ПРЫТОК НОВЫХ ЛЮДЗЕЙ»

Гэтыя спецыялісты заўсёды патрэбныя, іх не бывае вельмі шмат. Падрыхтоўка кадраў для арганізацый культуры — адна з актуальных тэм, якія абмяркоўваюцца ў галіне на розных узроўнях. І рашэнні трэба шукаць найперш у навучальных установах, якія рыхтуюць спецыялістаў для культуры. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў — базавая навучальная ўстанова для гэтага: тут чатыры факультэты, 15 спецыяльнасцяў, 28 прафілізацый. І кожны год выпуск каля 500 спецыялістаў, у якіх мае патрэбу краіна. Пра гэта наша размова з рэктарам БДУКМ Наталляй КАРЧЭЎСКАЙ.

— Ці ёсць сёння дастатковы прыток людзей, гатовых працаваць у культурнай сферы?

— Кожны год падчас уступнай кампаніі ў нашу ВНУ ёсць конкурс — значыць, ёсць цікавасць да гэтых спецыяльнасцяў. Іншае пытанне, што айчыннай культуры неабходна больш кадраў, чым сёння можа выпусціць наш універсітэт ці іншая навучальная ўстанова галіны.

СТАР. 7

На ўласныя вочы

Краіна гармоніі і прыгажосці

Прагуляліся па квітнеючым Цэнтральным батанічным садзе: расказваем аб ураджаннях

Упрыгожаныя буйнымі кветкамі магноліі, палі рознакаляровых нарцысаў і цюльпанаў, стройныя сакуры, што асыпаюць бязважкія пялёсткі на дагледжаныя дарожкі... Батанічны сад — месца, напоўненае спакоем і прыгажосцю. Далёка не ўсе мінчане і госці сталіцы ўключаюць яго наведванне ў праграму выхаднога дня. І дарэмна: тут можна атрымаць мноства станоўчых эмоцый.

Схаваны паміж шумнымі вуліцамі ў цэнтры Мінска, батанічны сад падорыць пачуццё гармоніі з прыродай. І калі вы стаміліся ад гарадскога шуму і мітусні, пабываць тут цяпер самы час, бо вясна — пара цвіцення.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

СТАР. 12

З першых вуснаў

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА І ІЛЬХАМ АЛІЕЎ НАВЕДАЛІ ТЭРЫТОРЫІ АЗЕРБАЙДЖАНА, ЯКІЯ АДРАДЖАЮЦЦА

У рамках дзяржаўнага візіту ў Азербайджан Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сумесна з Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым наведалі тэрыторыі рэспублікі, якія адраджаюцца.

Раніцай 17 мая Аляксандр Лукашэнка прыляцеў у Фізулі. У аэрапорце каля трапа самалёта яго сустрэў Ільхам Аліеў. Прэзідэнт Азербайджана коратка расказаў беларускаму калегу аб работах па аднаўленні і развіцці гэтых тэрыторый, будаўніцтве новых інфраструктурных аб'ектаў. Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з новым аэрапортам. Фізулінскі міжнародны аэрапорт — адзін з сямі міжнародных аэрапортаў краіны (неўзабаве іх стане яшчэ больш). Гэта паветраная гавань звязвае сталіцу Азербайджана з Карабахам. Аэрапорт пачалі будаваць у студзені 2021 года, а ўжо ў верасні тут прызямліўся першы самалёт. Цырымонія адкрыцця аэрапорта адбылася праз месяц з удзелам прэзідэнтаў Азербайджана і Турцыі.

Пасля агляду паветранай гавані кіраўнікі дзяржаў у суправаджэнні вялікага картэжа накіраваліся ў горад. Фізулі былі вернуты пад кантроль Азербайджана 17 кастрычніка 2020 года. Горад валодае вялікім транспартна-лагістычным патэнцыялам, паколькі знаходзіцца на скрыжаванні асноўных транспартных артэрый Карабахскага і Усходне-Зангезурскага эканамічных раёнаў Азербайджана. Згодна з генеральным планам, да 2040 года насельніцтва Фізулёў павялічыцца да 50 тыс. чалавек (для параўнання: у канцы 1980-х тут пражывала каля 17 тыс. грамадзян, цяпер — усяго толькі пара тысяч). У час паездкі Аляксандр Лукашэнка і Ільхам Аліеў агледзелі тэрыторыі горада, разбураныя аб'екты і перспектыўныя раёны для забудовы. Па маршруце прэзідэнты паехалі ў адной машыне, прычым за рулём быў азербайджанскі лідар.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з экспазіцыямі, якія адлюстроўваюць дынаміку аднаўлення разбураных аб'ектаў, пасля чаго абодва лідары накіраваліся ў Шушу. У савецкія гады гэты горад уваходзіў у склад Нагорна-Карабахскай аўтаномнай вобласці Азербайджанскай ССР, а пасля распаду Савецкага Саюза кантралявaўся непрызнанай Нагорна-Карабахскай Рэспублікай. У лістападзе 2020 года Азербайджан аднавіў кантроль над горадам, што было замацавана трохбаковай заявай Азербайджана, Арменіі і Расіі. Цяпер у Шушы таксама праводзяцца аднаўленчыя работы, будуецца жыллё для вяртання азербайджанскіх бежанцаў.

Кіраўнікі дзяржаў наведалі жылы масіў горада, азнаёміўшыся з жыллёвымі ўмовамі, памятныя мясціны і музейна-выставачную экспазіцыю аб дзейнасці Гейдара Аліева. Аляксандр Лукашэнка і Ільхам Аліеў таксама агледзелі трактарную тэхніку, падараную гораду Прэзідэнтам Беларусі. «Карыстайся. Спадабаецца — дабавім яшчэ», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле БелТА.

З нагоды

«СЯМ'Я — ГЭТА ГАЛОЎНАЯ ШКОЛА НАБОЖНАСЦІ, ШКОЛА МУДРАСЦІ І ШКОЛА ЖЫЦЦЯ»

Наталля КАЧАНАВА прыняла ўдзел у адкрыцці Першага сямейнага фестывалю

Выступаючы на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця Першага сямейнага фестывалю «РАЗАМ», арганізаванага Беларускім саюзам жанчын і прысвечанага Дню сям'і, Старшыня Савета Рэспублікі выказала словы ўдзячнасці БСЖ за такую цудоўную ініцыятыву. Спікер упэўнена, што гэтая ініцыятыва стане яшчэ адной добрай традыцыяй правядзення ў нашай краіне гэтага важнага міжнароднага і рэспубліканскага свята.

Фота БелТА.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў фестывалю, Наталля Качанава падзякавала ім за актыўную грамадзянскую пазіцыю, жыццесцвярджальны настрой, спагадлівасць і адкрытасць, гатоўнасць дзяліцца сваім пазітыўным сямейным вопытам. «Кожная з сем'яў — годны прыклад для пераймання ў частцы захавання і прымнажэння традыцыйных каштоўнасцяў беларусаў, папулярызацыі народнай творчасці, абароны гістарычнай праўды, патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення і заслугоўвае слоў захаплення і пахвалы», — падкрэсліла яна.

Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што ахова мацярынства і дзяцінства, падтрымка шматдзетных і маладых сем'яў, асаблівы клопат аб людзях з інваліднасцю і людзях пажылога ўзросту, іншыя напрамкі сямейнай палітыкі з'яўляюцца стратэгічным прыярытэтам нашай дзяржавы. Спікер акцэнтавала ўвагу на тым, што Прэзідэнт практычна ў кожным сваім Пасланні беларускаму народу і парламенту, у кожным рашэнні робіць акцэнт на выхаванні моладзі, падтрымцы сям'і, адраджэнні традыцыі шматдзетных сем'яў. Як устанавіў кіраўнік дзяржавы, «культ паўнацэннай класічнай сям'і з двума і больш дзецьмі павінен стаць стылем жыцця беларусаў».

«Вядома, шматдзетнасць з'яўляецца самым правільным адказам на дэмаграфічныя выклікі, з якімі сёння сутыкаецца наша краіна, і, акрамя таго, фарміруе зусім іншае аблічча грамадства — больш узаемазвязанага, давернага і гуманнага, — звярнула ўвагу спікер. — Гэта тое, да чаго нам, беларусам, трэба імкнуцца. Гэтыя пытанні рэгулярна ўключаюцца ў парадак дня Усебеларускага народнага сходу. Відавочна, што прыярытэт бягучай пяцігодкі «Шчаслівая сям'я», які прадугледжвае ўмацаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, заснаваных на фізічным і духоўным дабрабыце, выхаванні дзяцей і моладзі, клопаце пра старэйшае пакаленне, — непераходны і ніколі не страціць сваёй актуальнасці. Бо сям'я — гэта галоўная школа набожнасці, школа мудрасці і школа жыцця, і асабліва ярка гэта праяўляецца ў шматдзетных сем'ях».

Сямейная палітыка — нязменны прыярытэт у рабоце Савета Рэспублікі. Удасканальваецца сямейнае заканадаўства, эфектыўна функцыянуе кансультатыўны савет па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, рэгулярна праводзяцца тэматычныя мерапрыемствы, многія з якіх — сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой. У мінулым годзе з удзелам сем'яў розных пакаленняў з усіх рэгіёнаў краіны ўпершыню адбылася «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава».

«Наша агульная мэта — захаванне і папулярызацыя традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, умацаванне інстытута сям'і, — адзначыла Наталля Качанава. — Сям'і, якая служыць надзейнай апорай дзяржаве. Сям'і, дзякуючы якой забяспечваецца пераемнасць пакаленняў, адзінства і згода ў грамадстве. Сям'і, якая выхоўвае сапраўдных патрыётаў, гатовых абараніць свабоду і незалежнасць сваёй Айчыны, якія неймаверная цаной 80 гадоў таму абаранілі нашы бацькі, дзяды і прадзеды. У сям'і дзіця павінна ўсёй душой, усім сэрцам адчуць, у якой вялікай краіне яно жыве, як шмат зрабілі для гэтага старэйшыя пакаленні. Менавіта такі эталон сям'і — гэта складовая і неад'емная частка нашай нацыянальнай ідэі, адна з сакральных крэпаў, крытэрый якасці беларускай нацыі, гарантыя будучыні суверэннай Рэспублікі Беларусь».

Па словах спікера, дзякуючы паслядоўнай дзяржаўнай палітыцы, у Беларусі створана ўнікальная, цэласная сістэма падтрымкі сям'і і дзяцей. Значныя поспехі ў гэтай сферы пацвярджаюцца тым ліку высокімі пазіцыямі нашай краіны ў міжнародных рэйтынгах. Напрыклад, мы займаем 25-е месца (з 179) па самых камфортных умовах для мацярынства і адносімся да 50 найлепшых краін свету па вядзенні цяжарнасці і арганізацыі родаў.

«Без перабольшання можна канстатаваць, што і па аб'ёме, і па якасці дапамогі сем'ям з дзецьмі Беларусь уваходзіць у лік сусветных лідараў, — канстатавала Старшыня Савета Рэспублікі. — Акрамя таго, у сённяшніх геапалітычных рэаліях наша краіна становіцца пунктам глабальнага прыцягнення для прыхільнікаў сямейных і традыцыйных каштоўнасцяў. Да нас на сталае месца жыхарства пераязджаюць грамадзяне розных дзяржаў, якія імкнуцца абараніць сваіх дзяцей ад навамодных ліберальных павеваў, якія супярэчаць не толькі нормам маралі і маральнасці, але і ўсякаму разумнаму сэнсу. На беларускай зямлі яны знаходзяць сваю духоўную Радзіму. Безумоўна, у сучасных дасягненнях нашай краіны ў сферы сямейнай палітыкі ёсць і асабісты ўклад кожнага з вас, бо мы ўсе — беларускі народ — адна вялікая сям'я, якая жыве ў агульным доме пад назвай Рэспубліка Беларусь. Мы і надалей разам павінны захаваць і перадаць наступным пакаленням нашу любімую Беларусь такой жа мірнай, прыгожай, шчаслівай, якая яна ёсць у нас. Разам мы можам шмат, разам мы можам усё!»

Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.

Героі Беларусі

НАЗАЎСЁДЫ — У ГІСТОРЫІ КРАІНЫ

На мітынгу ў Баранавічах ушанавалі памяць лётчыкаў-герояў Андрэя Нічыпорчыка і Мікіты Куканенкі. У іх гонар таксама адкрыта мемарыяльная дошка

Учора ў Баранавічах адбылося жалобнае мерапрыемства з нагоды трэцяй гадавіны трагедыі ў небе і ў памяць аб лётчыках-героях.

Нагадаем, 19 мая 2021 года, падчас выканання вучэбна-трэніровачнага палёту, пацярпеў крушэнне ваенны самалёт Як-130 Лідскай штурмавой авіябазы, якім кіравалі 33-гадовы маёр Андрэй Нічыпорчык і 22-гадовы лейтэнант Мікіта Куканенка. Экіпаж імкнуўся вывесці амаль што некіруемы самалёт далей ад густанаселенай забудовы ў раёне вуліцы Розы Люксембург. І лётчыкам гэта ўдалося зрабіць. Цаной уласных жыццяў...

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за мужнасць і гераізм, праяўленыя пры выкананні вайсковых абавязкаў, лётчыкам пасмяротна было прысвоена званне Героя Беларусі. Праз год на месцы падзення самалёта быў адкрыты мемарыял у выглядзе гранітнай плиты і двух каваных журавлёў, якія ляцяць у неба. А на пліце накрэслены словы «Назаўсёды ў мірным небе».

У Баранавічах шануюць памяць герояў-лётчыкаў. Іх імёнамі названы вуліцы горада, а іх подзвігу прысвечана экспазіцыя ў Музеі народнага адзінства сярэдняй школы № 1 імя С. І. Грыцаўца. Цяпер кожны год у майскія дні каля мемарыяла збіраюцца людзі: таварышы па службе лётчыкаў-герояў, удзячныя гараджане, прадстаўнікі грамадскасці, школьнікі і студэнты.

Напярэдадні памятнай даты на шматпавярховым доме ў мікрараёне Паўночны-3 адкрылі мемарыяльную дошку ў гонар подзвігу лётчыкаў. Дом знаходзіцца на вуліцы, названай імем аднаго з іх — Андрэя Нічыпорчыка. Дошка ўстаноўлена па ініцыятыве Баранавіцкага гарадскога аб'яднання прафсаюзаў.

Уладзімір Нічыпорчык, бацька загінулага лётчыка, выказаў падзяку кіраўніцтву горада і ўсім гараджанам, якія захоўваюць памяць пра сына і яго таварыша.

У поўдзень каля мемарыяла па вуліцы Розы Люксембург адбыўся мітынг, у якім акрамя жыхароў Баранавічаў удзельнічалі 150 школьнікаў з Ліды, вучняў школ, якія носяць імёны герояў.

— Подзвіг Андрэя Нічыпорчыка і Мікіты Куканенкі назаўсёды ўпісаны ў гісторыю суверэннай Беларусі, — сказаў **старшыня Баранавіцкага гарвыканкама Максім АНТАНЮК**. — Мы заўсёды будзем памятаць верных прысязе афіцэраў, Герояў Беларусі, сапраўдных патрыётаў сваёй Айчыны, на іх подзвігу будзем выхоўваць маладое пакаленне.

— Мы зробім усё, каб памяць пра нашых таварышаў жыла ў кожным куточку нашай краіны, а сённяшнія лётчыкі раўняліся на герояў, — сказаў **намеснік камандуючага ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны па ідэалагічнай рабоце падпалкоўнік Эдуард ЖМАКІН** і яшчэ раз падзякаваў бацькам за выхаванне сыноў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Фота тэлеграм-канала «Баранавічы».

Парламенцкі дзённік

НАМ ТРЭБА ЎНОСІЦЬ АБГРУНТАВАНЫЯ ПРАПАНОВЫ, ЯКІЯ ІДУЦЬ АД ЖЫЦЦЯ

У Палаце прадстаўнікоў прайшоў семінар, прысвечаны арганізацыі бюджэтнага працэсу

У Палаце прадстаўнікоў прайшоў семінар на тэму «Арганізацыя бюджэтнага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь». Удзел у семінары прынялі члены Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Семінар даў магчымасць парламентарыям новага склікання азнаёміцца са спецыфікай работы над асноватворнымі дакументамі ў бюджэтна-падатковай сферы. А гэта, у сваю чаргу, мае вялікае значэнне для падрыхтоўкі і прыняцця якасных законаў, дапаможа павысіць эфектыўнасць дзейнасці. З асаблівасцямі бюджэтнага працэсу дэпутатаў знаёмілі міністр фінансаў Юрый СЕЛІВЕРСТАЎ, міністр па падатках і зборах Сяргей НАЛІВАЙКА, першы намеснік міністра эканомікі Андрэй КАРТУН і намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Андрэй ЛАБОВІЧ.

«У найбліжэйшы час Палаце прадстаўнікоў трэба будзе зацвердзіць справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту і бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва за мінулы год, а восенню — разгледзець «бюджэтна-падатковы пакет» на 2025 год. Для Нацыянальнага сходу восьмага склікання прыняцце такіх законапраектаў будзе новым вопытам у сферы заканадаўчага забеспячэння сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны. І гэтую работу мы павінны ажыццяўляць у рэчышчы даручэнняў кіраўніка дзяржавы, які неаднаразова ўказваў на неабходнасць сур'ёзнага, крытычнага падыходу да праекта бюджэту з боку дэпутацкага корпуса, — адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЕЕНКА**. Ён заўважыў, што парламентарыямі папярэдніх скліканняў напрацавана добрая практыка падрыхтоўкі да разгляду «бюджэтнага пакета». Яна будзе ўзята за аснову і сёлетнім скліканнем.

Дэпутаты і сенатары ўвайшлі ў склад міжведамасных рабочых груп па падрыхтоўцы праекта рэспубліканскага бюджэту і прапаноў па спрашчэнні падатковай сістэмы. «Нам трэба ў поўнай меры выкарыстаць гэтую магчымасць і ўжо цяпер уносіць абгрунтаваныя прапановы, якія ідуць ад жыцця. Іх крыніцамі могуць быць ваш багаты прафесійны вопыт, а таксама інфармацыя, якая атрымліваецца ў ходзе ўзаемадзеяння з рэспубліканскімі і мясцовымі органамі ўлады, зносін з выбаршчыкамі, працоўнымі калектывамі, прадстаўнікамі дзелавых колаў. Тым больш што ўрад у гэтай рабоце адкрыты і гатовы да супрацоўніцтва з дэпутацкім корпусам», — падкрэсліў Ігар Сергеенка.

З 1 студзеня 2009 года дзейнічае Бюджэтны кодэкс Рэспублікі Беларусь — сістэмаўтваральны акт бюджэтна-фінансавай сістэмы, які можна назваць «бюджэтнай Канстытуцыяй». «Кодэкс дакладна рэгламентуе ўсе стадыі бюджэтнага працэсу, у тым ліку парадак складання, разгляду і зацвярджэння рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, а таксама справаздач аб іх выкананні. Гэта дазваляе парламенту і мясцовым Саветам дэпутатаў своечасова, да пачатку новага фінансавага года прымаць бюджэты, а органам выканаўчай улады— максімальна эфектыўна выкарыстоўваць фінансавыя рэсурсы для забеспячэння сацыяльнай абароны грамадзян і скарачэння дысбалансу паміж рэгіёнамі»,— заўважыў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Як адзначыў у размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Васіль ПАНАСЮК**, дэпутатаў восьмага склікання чакае карпатлівая і адказная праца над пакетам бюджэтных дакументаў. За аснову будзе ўзяты вопыт і практыка дэпутатаў папярэдняга склікання. Парламентарыі ўвайшлі ў склад міжведамасных рабочых груп па падрыхтоўцы праекта рэспубліканскага бюджэту і прапаноў па спрашчэнні падатковай сістэмы. «Гэта дае магчымасць на пачатковым этапе фарміравання рэспубліканскага бюджэту разгледзець надзённыя пытанні не толькі эканамічнага, але і сацыяльнага характару, гэта значыць, дэпутаты, працуючы ў акругах, сукупна збіраючы прапановы і заўвагі як суб'ектаў гаспадарання, юрыдычных асоб, так і непасрэдна грамадзян, маюць права ўнесці свае прапановы на гэтым этапе фарміравання галоўнага фінансавага дакумента краіны, каб гэта было максімальна ўлічана пры яго прыняцці і зацвярджэнні да канца года», — растлумачыў Васіль Панасюк.

Валерыя СЦЯЦКО.

Міжнародныя стасункі

Ігар СЕРГЕЕНКА:

СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ І ТУРЦЫІ БУДУЕЦЦА НА АСНОВЕ СЯБРОЎСТВА І ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергеенка сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Турцыі ў Беларусі Гючлю Джэмам Ышыка, які пачынае сваю дыпламатычную місію ў нашай краіне.

Фота БелТА.

«Упэўнены, што існуючы ў вас салідны вопыт дыпламатычнай службы, работы ў Адміністрацыі Прэзідэнта Турцыі і Міністэрстве нацыянальнай абароны дасць магчымасць вам хутка ўваходзіць у курс спраў і ўнесці свой уклад у развіццё беларуска-турэцкага супрацоўніцтва», — адзначыў Ігар Сергеенка.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што Беларусь паслядоўна выступае за мір і стабільнасць. «Наша краіна — надзейны партнёр, які праводзіць адкрытую палітыку на рынцыпах даверу і раўнапраўя. Аб гэтым гаварылася Прэзідэнтам Беларусі дастаткова падрабязна ў ходзе праведзенага нядаўна Усебеларускага народнага сходу, — сказаў ён. — Адносіны паміж нашымі краінамі ўжо працяглы перыяд будуюцца на аснове сяброўства і ўзаемаразумення. У гэтым працэсе галоўная роля належыць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Лукашэнку і Прэзідэнту Турэцкай Рэспублікі Рэджэпу Таіпу Эрдагану. Кіраўнікі дзяржаў адкрыта абменьваюцца думкамі па пытаннях двухбаковага ўзаемадзеяння, міжнароднай праблематыкі, па пытаннях развіцця і ўмацавання беларуска-турэцкіх адносін».

Ігар Сергеенка зрабіў акцэнт на тым, што сяброўскія адносіны падтрымліваюцца і паміж заканадаўчымі органамі нашых краін. Дзейнічаюць пратакол аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Вялікім нацыянальным сходам Турэцкай Рэспублікі, падпісаны ў 2013 годзе, і сумесная заява аб супрацоўніцтве ад 2018 года. Праводзяцца абмены візітамі, сустрэчы на ўзроўні старшынь парламентаў, груп дружбы, анлайн-кансультацыі і іншыя. «Новае скліканне дэпутацкага корпуса працягне такое ўзаемадзеянне. У найбліжэйшы час у Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь восьмага склікання будзе сфарміравана рабочая група па супрацоўніцтве з Вялікім нацыянальным сходам Турэцкай Рэспублікі. Са свайго боку я адкрыты да кантактаў са старшынёй парламента Турцыі спадаром Нуманам Куртулмушам у любых фарматах і на любых пляцоўках», — запэўніў ён.

«Нашы краіны з'яўляюцца дружалюбнымі, дружалюбнымі з'яўляюцца нашы народы. Вельмі добрыя адносіны аб'ядноўваюць кіраўнікоў нашых дзяржаў. Чаканні прэзідэнтаў ад нас — гэта паляпшэнне двухбаковых адносін ва ўсіх сферах. Мая задача як пасла — існуючыя адносіны паміж нашымі краінамі вывесці на новы ўзровень. Гэта магчыма ў форме інтэнсіфікацыі візітаў, у тым ліку па лініі груп сяброўства. Мы маем намер і вельмі хочам развіваць адносіны паміж нашымі краінамі ва ўсіх сферах, уключаючы міжпарламенцкае супрацоўніцтва. Беларусь знаходзіцца для нас на стратэгічна важным месцы. Цяпер значэнне гэтага яшчэ больш узрастае. Мы ведаем аб гэтым», — падкрэсліў Гючлю Джэм Ышык.

У размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Сяргей РАЧКОЎ** адзначыў, што ў Беларусі і Турцыі вялікі патэнцыял для супрацоўніцтва. Па яго словах, беларуска-турэцкія адносіны развіваюцца дынамічна па лініі палітыкі, эканомікі, гуманітарнага супрацоўніцтва. Вялікі ўклад у развіццё сяброўскіх адносін уносяць і парламентарыі. «Мы імкнёмся падтрымліваць адзін аднаго і ў міжнародных парламенцкіх структурах. Эканоміка развіваецца, дастаткова сказаць, што апошнія некалькі гадоў тавараабарот складае каля мільярда долараў. І мы ўпэўнена ідзём да мэты ў паўтара мільярды долараў. Станоўчыя вынікі ў гандлі паслугамі. Для беларускага боку важныя пытанні інвестыцыйнага супрацоўніцтва. У нашай краіне працуе больш за 120 прадпрыемстваў з турэцкім капіталам, у Турцыі працуе больш за 100 кампаній з беларускім капіталам. Гуманітарнае супрацоўніцтва таксама на належным узроўні. Мы дапамагаем Турэцкай Рэспубліцы ў ліквідацыі наступстваў прыродных стыхійных бедстваў», — расказаў Сяргей Рачкоў.

Валерыя СЦЯЦКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Амерыканскія чыноўнікі працягваюць звальняцца ў знак пратэсту супраць падтрымкі ЗША дзеянняў Ізраіля

Спецыяльны памочнік кіраўніка адміністрацыі МУС ЗША Лілі Грынберг Кол падала ў адстаўку з-за падтрымкі Вашынгтонам дзеянняў Ізраіля. Пра гэта паведаміў тэлеканал «Аль-Джазіра». У сваёй заяве аб адстаўцы Лілі Грынберг Кол напісала, што не можа больш «з чыстым сумленнем прадстаўляць» адміністрацыю, якая падтрымлівае генацыд, што праводзіцца Ізраілем на тэрыторыі сектара Газа. У інтэрв'ю выданню The Washington Post Грынберг Кол падкрэсліла, што выступае супраць «калектыўнага пакарання мільёнаў нявінных палестынцаў шляхам перамяшчэння, голаду і этнічных чыстак». Раней супрацоўнік разведвальнага ўпраўлення Міністэрства абароны ЗША Харысан Ман звольніўся ў знак пратэсту супраць падтрымкі Вашынгтонам дзеянняў Ізраіля ў сектары Газа. У сакавіку супрацоўніца Дзярждэпартамента Анэль Шэлін, якая курыруе пытанні захавання правоў чалавека на Блізкім Усходзе, таксама падала ў адстаўку па той жа прычыне.

У Вялікабрытаніі некаторых зняволеных выпусцяць на волю з-за недахопу месцаў у турмах

Урад Вялікабрытаніі вырашыў датэрмінова вызваліць частку злачынцаў у сувязі з перапоўненасцю турмаў. Аб гэтым піша агенцтва Reuters. Адзначаецца таксама, што некаторыя судовыя слуханні будуць адкладзеныя ў межах прынятых экстраных захадаў для барацьбы з недахопам месцаў у турмах. Як удакладняе агенцтва, за апошнія 30 гадоў колькасць зняволеных падвоілася ў Англіі і Уэльсе з-за павелічэння тэрмінаў пакаранняў і ўзмацнення жорсткасці падыходу да злачынстваў, якія звязаныя з наркотыкамі і прымяненнем гвалту. Падкрэсліваецца, што вызваленыя будуць знаходзіцца пад строгім наглядам. Гэтая мера не будзе распаўсюджвацца на злачынцаў, асуджаных за тэрарызм, сексуальныя ці цяжкія гвалтоўныя злачынствы.

Карціна Клода Манэ прададзена на аўкцыёне ў Нью-Ёрку амаль за $35 млн

Карціна вядомага французскага імпрэсіяніста Клода Манэ «Мель у Жыверні», напісаная ў 1893 годзе, прададзена на таргах у Нью-Ёрку за $34,8 млн. Аб гэтым паведаміў тэлеканал France 24. Па словах прэс-сакратара аўкцыённага дома Sotheby's, адным з самых каштоўных лотаў стаў твор Клода Манэ. Яго карціна была прададзена за восем «хвілін дэбатаў». Работа брытанска-мексіканскай мастачкі Леаноры Карынгтан «Адцягненні Дагаберта» пабіла ўласны аўкцыённы рэкорд. За яе заплацілі $28,5 млн «пасля дзесяцігадзінных бітваў». «Гэтая падзея ставіць Карынгтан у пяцёрку найлепшых жанчын-мастачак, апярэджваючы мужчын-сюррэалістаў, такіх як Макс Эрнст або Сальвадор Далі», — адзначаецца ў матэрыяле. На аўкцыёне дома Sotheby's было прададзена творaў сучаснага мастацтва на суму каля $115 млн, у тым ліку карціна амерыканскага мастака Жана-Мішэля Баскія за $32 млн.

Спецыяльны рэпартаж

ПАД КАНТРОЛЕМ

Карэспандэнты «Звязды» паназіралі, як забяспечваецца ахова грамадскага парадку на Мінскім моры

З устанаўленнем цёплага надвор'я паркі, пляжы, зоны адпачынку быццам ажылі. Людзі імкнуцца на прыроду, каб удосталь надыхацца вясеннім паветрам, пагрэцца на ўжо даволі цёплым сонейку, атрымаць асалоду ад першых кветак, птушыных спеваў і бязвоблачнага неба. Аб тым, каб адпачынак быў яшчэ і бяспечны, клапоцяцца супрацоўнікі органаў унутраных спраў. З наступленнем цяпла ў месцах масавага адпачынку кантроль узмоцнены: каб забяспечыць правапарадак, міліцыянеры нясуць службу і днём, і ноччу.

Адно з найбольш папулярных месцаў адпачынку ў мінчан і гасцей сталіцы — Мінскае мора — патрабуе ад праваахоўнікаў асаблівай увагі. Тут шматлюдна з самых першых цёплых дзён і да позняй восені. У спёку ўвогуле яблыку нельга ўпасці. Каб заняць альтанку і пасмажыць на прыродзе шашлык, людзі едуць да мора з самай раніцы. Выхаднымі на пляжы праводзяцца дыскатэкі. Як на адказным участку міліцыянерамі ажыццяўляецца дзяжурства, паназіралі карэспандэнты газеты «Звязда».

Нецвярозым у вадзе не месца!

Нягледзячы на будні дзень і абедзенны час, на Мінскім моры людзей хапае. Адны размясціліся на шэзлонгах і ловяць сонечныя промні, іншыя распальваюць мангал, а нехта ўжо і абедае толькі што пасмажаным мясам, водар якога наганяе апетыт. Байдаркі, парускі і катары калышуць водную роўнядзь. Хтосьці пад кронамі дрэў уладкаваў гамак і, утаіўшыся ад гоману, чытае кнігу. Дзеці, будучы басанож у вадзе, будуюць пясочныя замкі.

Знаёмімся з міліцыянерамі патрульна-паставой службы, якія заступілі на дзяжурства. Сёння яны нясуць патруляванне ўдваіх і на аўтамабілі. Выхаднымі і ў святочныя дні патруль узмацняецца пешымі нарадамі і нарадам на мотатранспарце, дапамогу калегам аказваюць і супрацоўнікі АМАПа.

Міліцыянер 3-га ўзвода роты патрульна-паставой службы міліцыі грамадскай бяспекі Мінскага РУУС сяржант міліцыі Андрэй ПАТАЧЫЦ расказаў, што вырашыў пайсці ў органы ўнутраных спраў будучы ў арміі. Малады чалавек служыў ва ўнутраных войсках, у роце ганаровай варты. «Калі служба блізілася да завяршэння, прапанавалі пайсці ў міліцыю, — расказвае ён. — Не раздумваючы, пагадзіўся. У арміі атрымаў добрую загартоўку, таму без боязі бяруся за выкананне любых задач». Такім чынам, электрагазазваршчык па спецыяльнасці знайшоў сябе ў міліцыі, аб чым ніколькі не шкадуе.

А вось **камандзір групы 3-га ўзвода роты патрульна-паставой службы міліцыі грамадскай бяспекі Мінскага РУУС лейтэнант міліцыі Мікіта ЦІШУК** насіць міліцэйскія пагоны марыў з дзяцінства. Атрымаў вышэйшую юрыдычную адукацыю ў грамадзянскай ВНУ, затым пайшоў служыць у Мінскае РУУС. Гэта ўжо трэці працоўны сезон на Мінскім моры ў яго біяграфіі.

«Найбольш частымі правапарушэннямі тут з'яўляюцца распіццё алкагольных напояў і купанне ў забароненых месцах, — расказвае Мікіта Цішук. — Нягледзячы на тое, што на ўзбярэжжы нямала абсталяваных месцаў для купання, некаторых адпачывальнікаў усё роўна цягне ў ваду там, дзе гэта не прадугледжана. Як правіла, не звяртаюць увагу на папераджальныя знакі тыя, хто знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення. Такіх мы суправаджаем у Ждановіцкі аддзел міліцыі і прыцягваем да адміністрацыйнай адказнасці».

Дзеці — пад пільнай увагай дарослых!

Усяго ў зоне адказнасці супрацоўнікаў патрульна-паставой службы, якія дзяжураць на Мінскім моры, дзевяць пляжаў. За змену міліцыянеры па некалькі разоў аб'язджаюць іх на аўтамабілі. Спыніўшыся на пятым, дзе заўсёды найбольш шматлюдна, яны пакідаюць транспарт і працягваюць кантраляваць правапарадак пешшу.

Спыняемся каля кампаніі замежных грамадзян — як высвятляецца, кітайскіх студэнтаў. Міліцыянеры заўважаюць на стале бутэлькі з півам.

— Добры дзень! — вітаецца Мікіта Цішук і прадстаўляецца. — Спажываць алкаголь у грамадскім месцы забаронена, таму хавайце спіртное і адпачывайце далей.

Праз сваю сяброўку, якая, мяркуючы па ўсім, найлепш з іх размаўляе па-руску, маладыя людзі выбачаюцца і абяцаюць, што падобнае не паўторыцца.

Андрэй Патачыц удакладняе, ці ўсё ў хлопцаў і дзяўчат у парадку. Атрымаўшы станоўчы адказ, папярэджвае, каб не пакідалі асабістыя рэчы без нагляду і разводзілі агонь выключна ва ўстаноўленых месцах. Пажадаўшы маладым людзям добрага адпачынку, супрацоўнікі міліцыі ідуць далей.

Праз некалькі метраў — гучная кампанія смажыць шашлык. Падыходзім і бачым жанчын. Алкаголю на сталах няма, паводзяць сябе прыстойна. З прафілактычнай мэтай міліцыянеры папярэджваюць аб адказнасці за распіццё спіртнога ў грамадскіх месцах, нагадваюць аб правілах бяспекі каля вады, пытаюцца, ці ёсць з жанчынамі дзеці. Высвятляецца, што непаўналетніх сярод іх няма, таму рэкамендацыі, якія датычацца кантролю за дзецьмі, супрацоўнікі органаў унутраных спраў адрасуюць іншым адпачывальнікам. У прыватнасці, бабулі два-іх унукаў: каля самай вады яны будуюць пясочныя замкі. Пенсіянерка, якая побач загарае на шэзлонгу, дзякуе за слушныя парады і адзначае, што ўнукі знаходзяцца пад яе пільным кантролем.

Пакуль ідзём далей, міліцыянеры роты патрульна-паставой службы расказваюць, што не ўсе дарослыя, якія адпачываюць на Мінскім моры з дзецьмі, ажыццяўляюць належны кантроль за непаўналетнімі.

«Нярэдка назіраем сітуацыі, калі дзеці гуляюць самі па сабе, а бацькі ў гэты час занятыя сваімі справамі, — звяртае ўвагу Мікіта Цішук. — Напрыклад, сядзяць у тэлефонах і не бачаць, як іх малое дзіця ўжо лезе ў ваду. Або дзеці купаюцца, а дарослыя тым часам смажаць мяса. Калі мы бачым, што побач з непаўналетнімі нікога няма, падыходзім і пытаемся, з кім яны сюды прыйшлі і дзе іх бацькі. Высветліўшы неабходную інфармацыю, праводзім прафілактычную гутарку з дарослымі, тлумачым, чаму небяспечна пакідаць дзяцей без нагляду».

Пра гэта не па чутках ведае Анастасія, якая адпачывае на пляжы разам з чатырохгадовым сынам Ягорам. Мінскае мора маладая маці называе іх пясочніцай: сям'я жыве недалёка, таму практычна кожны дзень бавіць час каля вады.

«Тут бяспечна, — кажа яна. — Безумоўна, на гэта ўплывае і тое, што рэгулярна на Мінскім моры дзяжурыць міліцыя. Гэта дысцыплінуе людзей. Добра было б, каб адпачывальнікі былі яшчэ і больш уважлівымі ў адносінах да дзяцей, з якімі прыйшлі. Я працавала ў Таварыстве ратавання на водах, таму добра разумею, аб чым папярэджваюць міліцыянеры бацькоў. Людзі павінны не толькі ведаць правілы бяспекі на вадзе, але і выконваць іх. І канцэнтраваць сваю ўвагу ў першую чаргу на дзецях, а не на гаджэтах. Літаральна секунда — і можа адбыцца няшчасны выпадак. Гэта я як прафесіянал кажу».

Пры дрэнным самаадчуванні і ў непагадзь лепш заставацца дома

Развітаўшыся з Анастасіяй і Ягорам і пажадаўшы ім добрага адпачынку, ідзём далей. Да міліцыянераў звяртаецца сямейная пара, цікавіцца, ці ёсць на пляжы здраўпункт. Жанчына скардзіцца на галаўны боль і хоча памераць ціск. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў падрабязна тлумачаць, куды на Мінскім моры можна звярнуцца па медыцынскую дапамогу, суправаджаюць сужэнцаў да здраўпункта.

Пакуль ідзём, знаёмімся. Святлана і Пётр — з Карэліі, адпачываюць у беларускім санаторыі, які знаходзіцца побач з Мінскім морам. Прызнаюцца, што ім тут вельмі падабаецца.

— Тут спакойна, — удакладняе Святлана і заўважае, што ў гэтым ёсць і заслуга міліцыі. — Пры супрацоўніках органаў унутраных спраў людзі адчуваюць сябе ў бяспецы. У Расійскай Федэрацыі праваахоўнікамі таксама наладжаны кантроль за пляжамі, як правіла там, дзе адпачывае вялікая колькасць людзей. Міліцыянеры ажыццяўляюць патруль не толькі пешшу і на аўтатранспарце, а нават на конях.

Побач са здраўпунктам супрацоўнікі патрульна-паставой службы развітваюцца са Святланай і Пятром, пажадаўшы ім добрага адпачынку. Прагучалі ў адрас турыстаў і рэкамендацыі: у выпадку пагаршэння самаадчування лепш пазбягаць прамых сонечных промняў.

Таксама варта пакінуць месца адпачынку і тады, калі псуецца надвор'е. У сувязі з гэтым міліцыянеры прыгадалі выпадак мінулага года, калі ў навальніцу на Мінскім моры загінула маладая жанчына.

— Калі няма магчымасці хутка пакінуць месца адпачынку, падчас навальніцы варта выконваць простыя правілы бяспекі, — нагадвае Андрэй Патачыц. — Ні ў якім разе нельга хавацца пад дрэвамі і знаходзіцца ў вадзе. Калі навальніца застала вас знянацку, лепш перамясціцца на пляж, дзе не будзе побач дрэў, або перачакаць непагадзь у машыне.

Ва ўзаемадзеянні

На Мінскім моры міліцыянеры шчыльна ўзаемадзейнічаюць з супрацоўнікамі Таварыства ратавання на водах. Калі адпачывальнікі заплываюць за буйкі або купаюцца там, дзе гэта забаронена, праваахоўнікі адразу тэлефануюць ратавальнікам, і тыя аператыўна на маторнай лодцы выязджаюць па патрэбным маршруце. У сваю чаргу, калі грамадзяне ігнаруюць патрабаванні супрацоўнікаў Таварыства ратавання на водах, апошнія інфармуюць аб гэтым калег з міліцыі, у выніку чаго на такіх адпачывальнікаў складаецца пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні.

Як расказвае **вадалазратавальнік ратавальнай станцыі «Заслаўе-1» Аляксей ПАЗНЯК,** дзяжурства на Мінскім моры ажыццяўляецца круглы год: калі летам увага ратавальнікаў у першую чаргу скіравана на плыўцоў, то зімой нярэдка даводзіцца ратаваць рыбакоў. «На кожным пляжы дзяжураць нашы матросы, акрамя таго, мы рэгулярна вядзём кантроль пры дапамозе воднага транспарту, важная інфармацыя паступае і ад міліцыянераў, — кажа ён. — Як правіла, у зоне рызыкі — нецвярозыя. Аднак дзякуючы супрацоўнікам органаў унутраных спраў, якія своечасова рэагуюць на грамадзян «пад мухай», да вады мала хто з іх даходзіць. Самі праводзім прафілактычную работу з тымі, хто адпачывае».

Адным словам, на Мінскім моры, як і ў іншых месцах масавага адпачынку, створаны ўсе ўмовы, каб людзі цікава і з карысцю праводзілі вольны час. Тое, што іх бяспека знаходзіцца пад кантролем супрацоўнікаў унутраных спраў і ратавальнікаў, можна нават не сумнявацца. Аднак і самі адпачывальнікі павінны выконваць элементарныя правілы паводзін, быць уважлівымі да дзяцей, з якімі прыйшлі, не рызыкаваць, калі на тое няма неабходнасці. У такім выпадку ад адпачынку застануцца найлепшыя ўспаміны.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Урачыстасць

«ПАДМУРАК, НА ЯКІМ БУДУЕЦЦА ДЫЯЛОГ ГРАМАДСКАСЦІ З МІЛІЦЫЯЙ»

У МУС узнагародзілі журналістаў, якія асвятляюць міліцэйскую тэматыку

На працягу 19 гадоў Міністэрства ўнутраных спраў праводзіць конкурс на найлепшае асвятленне ў СМІ і інтэрнэце дзейнасці органаў унутраных спраў і ўнутраных войск. На працягу гэтага часу прадстаўнікі ведамства збіраюць журналістаў з усёй краіны, каб асабіста сказаць аб тым, што за іх публікацыямі і сюжэтамі — выратаваныя жыцці, няздзейсненыя злачынствы і правапарушэнні, упэўненасць грамадзян ва ўласнай бяспецы, вялікая колькасць ахвотных папоўніць шэрагі органаў унутраных спраў.

Расказваючы і паказваючы міліцэйскія будні, інфармуючы насельніцтва аб выкананні мер бяспекі і адказнасці за тыя ці іншыя правапарушэнні, сродкі масавай інфармацыі так ці інакш уплываюць не толькі на крымінагенную абстаноўку, але і ў цэлым на мікраклімат у грамадстве. У Міністэрстве ўнутраных спраў не хаваюць: мала рабіць сваю работу, яе яшчэ трэба ўмець паказаць. У сваю чаргу, журналісты, якія асвятляюць міліцэйскую тэматыку, ніколі не застануцца без работы: у кожным падраздзяленні ёсць інфармацыя, якую важна своечасова данесці да насельніцтва, служаць людзі, з якіх варта браць прыклад.

За 19 гадоў, якія праводзіцца конкурс, ён увесь час мадэрнізуецца. У першую чаргу, гэта датычыцца намінацый. Напрыклад, яшчэ некалькі гадоў таму такая намінацыя, як «Стоп, махляры!», была не актуальная. Цяпер жа кожны ведае, хто такія кіберзлачынцы: на жаль, на ўлоўкі тэлефонных махляроў і інтэрнэт-ашуканцаў трапіла нямала людзей. Апошнім часам ахвяр у кіберзлачынцаў становіцца менш — у гэтым заслуга і СМІ, якія рэгулярна асвятляюць гэтую праблематыку. Таму намінацыі, у якіх МУС прапаноўвае журналістам паспаборнічаць, запатрабаваны часам.

аб людзях, прафесіях, іміджы супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, матэрыялы непасрэдна аб рабоце міліцыі, — канкрэтызавала начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС. — Таму вельмі прыемна, што з году ў год «Звязда» прымае актыўны ўдзел у гэтым конкурсе. Мы віншуем вашага карэспандэнта, ад душы жадаем творчых поспехаў, новых праектаў, ідэй і рухацца наперад. Як кажа кіраўнік дзяржавы, час выбраў нас. Менавіта сумеснымі матэрыяламі зробім усё для таго, каб у нашай краіне было спакойна і бяспечна».

Плён шчыльнага ўзаемадзеяння

Сёлета на разгляд кампетэнтнага журы было прадстаўлена звыш 200 работ. Больш як 50 рэдакцыйных калектываў з усёй краіны спаборнічалі за перамогу ў той ці іншай намінацыі. А іх, дарэчы, было нямала: «Праект года», «На варце online», «Медыямайстар», «Весці рэгіёнаў», «Аб'ектыўна і прафесійна», «Дастукацца да сэрцаў», «Участковы заўсёды побач» і інш.

Падчас урачыстай цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў **намеснік міністра ўнутраных спраў Дзмітрый КАРЗЮК** выказаў удзячнасць аўтарам і калектывам СМІ, якія прынялі ўдзел у конкурсе, за пастаянную цікавасць да міліцэйскага ведамства і канструктыўнае супрацоўніцтва ў інфармацыйнай сферы. Ен падкрэсліў, што для міліцэйскага ведамства ўзаемадзеянне са сродкамі масавай інфармацыі мае асаблівае значэнне. «Гэта не толькі ацэнка нашай дзейнасці, але і камунікацыя, што дазваляе нам карэкціраваць работу і разам даносіць правільную, патрэбную інфармацыю да нашых грамадзян, — удакладніў Дзмітрый Карзюк. — Наша ўзаемадзеянне стварае той падмурак, на якім будуецца дыялог грамадскасці з міліцыяй, мацнее давер і павага да вартавых правапарадку».

Рэдактар аддзела газеты «Звязда» Вераніка Канюта стала пераможцам у намінацыі «Участковы заўсёды побач». У год, калі адзначалася 100-годдзе з Дня ўтварэння службы ўчастковых інспектараў міліцыі, у газеце выйшаў шэраг рэпартажаў аб прадстаўніках гэтай міліцэйскай прафесіі, тонкасцях службы. На старонках «Звязды» выходзіць сумесны праект рэдакцыі і Міністэрства ўнутраных спраў «Фарпост спакою», які паказвае шматгранную дзейнасць супрацоўнікаў органаў унутраных спраў.

Як звярнула ўвагу **начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў Наталля САХАРЧУК,** прэс-служба МУС узаемадзейнічае з рэдакцыяй «Звязды» на працягу многіх гадоў. «Гэта плённая і вельмі сур'ёзная сумесная работа, — падкрэсліла яна. — Напісаць артыкул няпроста. Для гэтага спачатку трэба знайсці інфармацыйную нагоду, затым адшукаць годнага чалавека, які мог бы аб гэтым кампетэнтна расказаць. Складана ўявіць газету і без фотакантэнту. Гэтае шчыльнае ўзаемадзеянне, падтрымка адзін аднаго ў выніку даюць станоўчы плён».

Па словах Наталлі Сахарчук, «Звязда» шырока асвятляе міліцэйскую тэматыку. «Гэта матэрыялы

Цікава і эфектыўна

У кулуарах цырымоніі ўзнагароджання карэспандэнты «Звязды» пагутарылі з лаўрэатамі і намінантамі конкурсу на найлепшае асвятленне ў СМІ і інтэрнэце дзейнасці органаў унутраных спраў і ўнутраных войск.

Як прызнаўся **спецыяльны карэспандэнт БелТА Андрэй ВАРАПАЙ,** які стаў пераможцам конкурсу ў намінацыі «На варце online», на пачатку свайго захаплення міліцэйскай тэматыкай было няпроста разабрацца ў спецыфіцы гэтай сферы. «Калі разабраўся, што да чаго, зразумеў, што нічога складанага няма, нават стала цікава, — заўважыў ён. — Працую з усімі падраздзяленнямі ведамства, у кожнага — свая спецыфіка. Таму сумна ніколі не бывае. Асабліва радасна, калі ад тваіх публікацый у выніку ёсць эфект. Тым больш калі ідзе размова аб правапарушэннях Правіл дарожнага руху, кіберзлачынствах, распаўсюджванні наркотыкаў. Калі гэта прафілактаваць, паказваць, якія могуць мець наступствы тыя ці іншыя дзеянні, то так ці інакш інфармацыя ўплывае на чытачоў, гледачоў і слухачоў».

Праектам года, па меркаванні журы, стаў праект рэдакцыі газеты «Пінскі веснік» — «Пяць дзён з аховай». Па словах **намесніка рэдактара рэдакцыі газеты «Пінскі веснік» Людмілы РЭБКАВЕЦ,** журналісты разам з пінскім аддзелам Дэпартамента аховы МУС ажыццявілі інтэрнэт-праект, у якім расказалі аб буднях супрацоўнікаў Дэпартамента аховы, гісторыі гэтага аддзела, людзях, якія там служаць, ветэранах падраздзялення.

«У нас наладжана вельмі шчыльнае ўзаемадзеянне з міліцыяй, — падкрэсліла Людміла Рэбкавец. — У кожным нумары штотыднёвіка выходзіць тэматычная старонка «Праваахоўнік», дзе ўтрымліваюцца навіны, інфармацыя аб акцыях, якія праводзіць міліцыя, адлюстраваны рэйды, грамадзянскія ініцыятывы органаў унутраных спраў. Мы расказваем аб людзях, якія выбралі гэтую прафесію: маладых міліцыянерах, вопытных супрацоўніках, ветэранах. Увогуле, матэрыялы на міліцэйскую тэматыку карыстаюцца папулярнасцю ў нашых чытачоў. Людзям заўсёды цікава ведаць аб бяспецы, адчуваць сябе абароненымі і бачыць, якім чынам гэта забяспечваецца».

Сярод лаўрэатаў конкурсу — і прадстаўнікі ведамасных прэс-службаў Міністэрства ўнутраных спраў. На пляцоўках уласных сацыяльных сетак яны дзеляцца актуальнымі навінамі сваіх падраздзяленняў, паказваюць святы і будні супрацоўнікаў, расказваюць, як папоўніць іх шэрагі. Напрыклад, і днём, і ноччу на пульсе падзей знаходзяцца аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў галоўнага ўпраўлення камандуючага ўнутранымі войскамі і Дэпартамента аховы. Невыпадкова каманды прафесіяналаў сталі пераможцамі ў намінацыі «Аб'ектыўна і прафесійна».

Начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў галоўнага ўпраўлення камандуючага ўнутранымі войскамі Дзяніс ПАРХЕЙЧУК звярнуў увагу на тое, што за інфармацыйным суправаджэннем усіх падзей, якія адбываюцца ва ўнутраных войсках, стаіць вялізная праца. «Патрабуецца немалы чалавечы рэсурс для таго, каб даводзіць інфармацыю цікава і заўсёды павышаць тую планку, якую некалі задалі, — патлумачыў ён. — Заўсёды імкнёмся перасягнуць саміх сябе, каб той кантэнт, які прапаноўваем нашым падпісчыкам, быў цікавы. Адна з нашых задач — папулярызацыя воінскай службы. Паказваем, якія людзі ў нас служаць, якія задачы выконваюць, каб разумелі, што быць ваеннаслужачым — няпроста, але вельмі ганарова. Найвышэйшая ацэнка, калі людзі кажуць, што пасля прагляду нашых роліка пайшлі служыць або паступілі на факультэт унутраных войскаў Ваеннай акадэміі».

Па словах **часова выконваючай абавязкі па пасадзе начальніка аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Дэпартамента аховы МУС Алены ГОМАН,** каманда, якая забяспечвае інфармацыйнае суправаджэнне гэтага міліцэйскага падраздзялення, максімальна зараджана, аддаецца прафесіі напоўніцу. «У першую чаргу, матывуе зваротная сувязь з нашымі падпісчыкамі і чытачамі, — падзялілася яна. — Мы імкнёмся ўлічыць іх меркаванне, рэгулярна чытаем каментары і зыходзім з запыту аўдыторыі. Служба ў Дэпартаменце аховы вельмі шматгранная, паўсядзённыя будні аховы вельмі насычаныя. Гледзячы на нашы відэаролікі ў інтэрнэце, маладыя людзі цікавяцца, як трапіць да нас на службу. А гэта дарагога варта».

Ніка МАЙСКАЯ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Да ведама дарослых

«ФЛЭТЫ» І «ЎПІСКІ» — ПАГРОЗА БЯСПЕЦЫ ДЗЯЦЕЙ!

Гэтыя словы з'явіліся ў слэнгу сучасных падлеткаў дастаткова даўно. Па сутнасці, гэта вечарынкі, якія ладзяць маладыя людзі ў кагосьці на кватэры. Усе яны звязаны з ужываннем псіхаактыўных рэчываў: алкаголю, цыгарэт, вэйпаў, наркотыкаў. Нярэдка кампаніі ўтвараюцца з незнаёмых паміж сабой гасцей, якія знаходзяць адзін аднаго праз сацыяльныя сеткі.

Падобнае баўленне часу нярэдка прыводзіць да трагічных наступстваў. Напрыклад, летась у Светлагорску на такім вось «флэце» непаўналетні выскачыў з акна 9 паверха. Некалькі тыдняў таму ў Гомельскім раёне 16-гадовая дзяўчына была дастаўлена з такой вечарынкі ў рэанімацыю з пераломам касцей зводу чэрапа. Аналагічных выпадкаў нямала.

— У бягучым годзе супрацоўнікамі інспекцый па справах непаўналетніх ужо выяўлена больш за 120 такіх п'яных вечарынак, — расказаў **намеснік начальніка аддзела ўпраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС Васіль ДЗЕМІДОВІЧ.** — У іх бралі ўдзел звыш 400 дзяцей, якіх перадалі бацькам. За распіццё алкаголю з непаўналетнімі да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 180 дарослых. У гэтых выпадках трагічных наступстваў удалося пазбегнуць.

Пачаўся дачны сезон, не за гарамі — летнія канікулы. Гэта час, калі дзеці могуць застацца дома адны пад маркай вывучыць урокі, сустрэцца з сябрам або сяброўкай. «Пастаянна ўдзяляйце ўвагу дзіцяці: тэлефануйце, цікаўцеся, дзе яно і з кім, — рэкамендуе Васіль Дземідовіч. — Калі сумняваецеся, папрасіце адправіць геаметку свайго бягучага месцазнаходжання або звязацца з вамі па відэасувязі. Надзвычай важна ведаць кола зносін непаўналетніх. Паважаныя бацькі, будзьце ў даверлівых узаемаадносінах са сваімі дзецьмі!»

Вераніка КАНЮТА.

Актуальна

Экс-суддзя Томаш ШМІТ:

«УРАД ПОЛЬШЧЫ АБСАЛЮТНА НЕ ЦІКАВІЦЬ, ШТО БЫЎ ПАРУШАНЫ ШЭРАГ ЗАКОНАЎ»

Былы польскі суддзя Томаш Шміт, які быў вымушаны з'ехаць у Беларусь, спрабаваў падаць дакументы аб парушэнні сваіх правоў у Пасольства Польшчы, аднак там адмовіліся іх прыняць. Нагадаем, былы суддзя з Варшавы раней на прэс-канферэнцыі ў Мінску заявіў, што асцерагаецца пераследу польскіх спецслужбаў, просіць палітычнага прытулку ў Беларусі і адмаўляецца ад статусу суддзі.

Сярод падрыхтаваных Томашам Шмітам дакументаў — заявы на імя міністра юстыцыі і на імя генеральнага пракурора, пісьмо на імя амбудсмена, дзе гаворыцца, што польскі ўрад парушыў шэраг законаў, у тым ліку польскую канстытуцыю, унутраныя законы краіны і міжнародныя законы. У тым ліку і Канвенцыю па правах чалавека.

— Консул сказаў, што не можа прыняць гэтыя дакументы і не можа са мной размаўляць. Я спытаў наўпрост: «У вас ёсць забарона ад польскіх улад? Напрыклад, ад міністра Сікорскага?» Ён ад мяне адвярнуўся і ўвайшоў у ліфт. Мне засталося толькі ўкінуць дакументы ў паштовую скрыню. Гэта было няпроста, бо паштовая скрыня аказалася закрытая. У мяне нейкім чынам атрымалася ўкінуць гэтыя заявы, але я не ведаю, якая будзе рэакцыя ад польскага ўрада. Я баюся, што іх проста выкінуць у сметніцу, і на гэтым усё скончыцца, — расказаў Томаш Шміт.

Адна з прычын такой рэакцыі — тое, што польскія ўлады загадзя ахрысцілі экс-суддзю шпіёнам.

— Я звярнуўся да міністра юстыцыі і генеральнага пракурора (у Польшчы гэтыя пасады сумяшчае адзін чалавек) з просьбай аб наглядзе за гэтай справай. Не ведаю, які будзе вынік і эфект, бо паважаны міністр Адам Боднар у польскіх медыя ўжо назваў мяне беларуска-расійскім шпіёнам. Гэтак жа, як і міністр Сікорскі назваў мяне шпіёнам яшчэ да таго, як прад'явіць абвінавачванні. У нармальнай дэмакратычнай краіне міністр замежных спраў пасля такіх слоў павінен быць неадкладна адхілены ад сваёй пасады. А тут мы маем справу з сітуацыяй, калі консул атрымаў забарону на кантактаванне са мной, і мне здаецца, гэта была забарона ад міністра Сікорскага, — падзяліўся Томаш Шміт.

Больш за тое, у Польшчы ўжо выдадзены ордэр на арышт экс-суддзі, рыхтуецца і еўрапейскі ордэр на арышт.

— Урад Польшчы абсалютна не цікавіць, што быў парушаны шэраг законаў. Мяне пазбавілі права на абарону, справядлівага разгляду маёй сітуацыі. Ужо выдадзены ордэр на мой арышт і былі выстаўлены супраць мяне абвінавачванні. Ёсць загад аб маім арышце. Рыхтуюць таксама і еўрапейскі ордэр аб арышце. Мая віна заключалася толькі ў тым, што я падаў заяву аб адстаўцы і меў на гэта поўнае права. І пачаў размаўляць з медыя, а былі гэта беларускія і расійскія медыя. У разумені польскага ўрада гэта шпіянаж.

Што датычыцца польскіх СМІ, то яны проста адмовіліся размаўляць з былым суддзёй.

— Дзе дэмакратыя і свабода слова? Дзе свабода выяўлення сваіх поглядаў, свайго меркавання? — задаецца пытаннямі экс-суддзя. — З вялікіх польскіх медыя ніхто са мной не захацеў размаўляць. Я напісаў, што я гатовы да дыялогу, але ўжывую, анлайн, каб не было ніякіх маніпуляцый, бо я не даверяю польскім медыя, яны напішуць тое, што ім выгадна. Ніхто з польскіх СМІ не пагадзіўся на анлайн-інтэрв'ю.

Няма сувязі ў Томаша Шміта і з пракуратурай, ніякіх абвінавачванняў напрамую ён так і не атрымаў:

— У маім выпадку ніхто мне не патлумачыў, якія абвінавачванні супраць мяне, на падставе якіх матэрыялаў, хоць сувязь са мной не з'яўляецца праблематычнай. Ёсць каналы, я адкрыты ў медыя. Пракуратура магла б удакладніць, на які адрас выслаць, але нічога такога не зрабілі. На самай справе я зусім не разумею, у чым мяне абвінавачваюць, чаму быў выдадзены ордар на мой арышт. Гэта як у кнізе Кафкі «Працэс»: чалавек не ведае, у чым ён вінаваты, але яго ўжо абвінавацілі.

Томаш Шміт лічыць, што такім чынам былі перш за ўсё парушаны яго права на абарону і права на справядлівае судовае разбіральніцтва.

— Правялі такі «капюшонны» суд, бо ў чым мяне абвінавачваюць, я магу даведацца, толькі арыентуючыся на тое, што пішуць польскія СМІ. Я хачу дабівацца сваіх правоў і на нацыянальным узроўні, і на еўрапейскім, — заявіў Томаш Шміт.

Таксама ён адзначыў, што атрымлівае ад суайчыннікаў словы падтрымкі, хтосьці нават называе яго героем, але ёсць і такія людзі, якія жадаюць яму смерці і пагражаюць. Аднак у Мінску былы польскі суддзя адчувае сябе ў бяспецы. У найбліжэйшы час пасля кансультацыі з юрыстамі ён плануе падаць прашэнне да беларускіх улад аб прытулку. Калі ёсць юрыдычная магчымасць, экс-суддзя хацеў бы атрымаць беларускае грамадзянства, адначасова захаваўшы і польскае.

Алена КРАВЕЦ.

Разумныя грошы

ЦЯПЕР ЗНЯЦЬ НАЯЎНЫЯ МОЖНА НА КАСЕ КРАМЫ

Пункты продажаў падключаюцца да сэрвісу па выдачы наяўных ад Беларусбанка

Калі вы жывяце ў населеным пункце, у якім да 20 тысяч чалавек, і карыстаецеся наяўнымі — гэтая навіна для вас. Цяпер, каб зняць грошы з карткі, ужо неабавязкова шукаць банкамат. Дастаткова звярнуцца ў найбліжэйшы гандлёвы пункт і пашукаць на касе спецыяльную налепку з зялёным кашальком — абазначэнне эквайрынгу ад гэтага банка. Яна азначае, што крама падключана да сэрвісу выдачы наяўных і тут вы можаце атрымаць неабходную суму грашовых сродкаў.

На дадзены момант умовы зняцця наяўных такія. Сума ў рамках адной аперацыі не павінна перавышаць 5 базавых велічынь (200 рублёў). Па картках Беларусбанка камісія за зняцце наяўных не спаганяецца.

Як нам паведамілі ў прэс-службе найбуйнейшай фінансавай установы, у Год якасці Беларусбанк працуе над тым, каб грашовыя паслугі былі даступныя ў кожным кутку краіны. Сёння ў сельскай мясцовасці і гарадах з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек да сэрвісу падключана каля 2300 магазінаў. З моманту ўкаранення сэрвісу ў 2020 годзе ўжо праведзена больш за 315 000 аперацый на агульную суму 22 мільёны рублёў.

Адзначаецца, што сэрвіс зручны не толькі пакупнікам, але і ўладальнікам юрыдычных структур. Пасля падключэння суб'екты гаспадарання павялічваюць тавараабарот за кошт прыцягнення дадатковых пакупнікоў, а таксама яны скарачаюць час на здачу выручкі і выдаткі на інкасацыю грашовай наяўнасці.

Бо эквайрынг з выдачай наяўных — гэта такі від паслугі, згодна з умовамі дагавора якога арганізацыя гандлю (сэрвісу) можа ажыццяўляць аперацыі з выкарыстаннем плацежных картак, звязаныя не толькі з рэалізацыяй тавараў, работ (паслуг), але і выдаваць наяўныя грашовыя сродкі ў беларускіх рублях трымальнікам картак банка і банкаў-рэзідэнтаў.

І яшчэ. Беларусбанк не спаганяе камісію за зняцце наяўных у такіх выпадках. За правядзенне дадзенай аперацыі можа спаганяцца плата банкамі, якія выпусцілі картку. Бо пры падключэнні сэрвісу па выдачы грошай у арганізацыях гандлю прымаюцца карткі ўсіх беларускіх банкаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1607. УНП 191021390
Продавец	ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Ленина, 46. УНП 100868495

Предмет аукциона (одним лотом)
Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16

ЛОТ № 1

Производственная база в составе: **производ. корпуса** (1130,5 кв. м, 500/С-49698; 4340,5 кв. м, 500/С-53224), **диспетчерская** (54,7 кв. м, 500/С-53818), **здание специализир. иного назначения (литейный цех)** (7664,8 кв. м, 500/С-47329), **компрессорная** (473,6 кв. м, 500/С-54017), **электропечь термическая** (39,8 кв. м, 500/С-54018), **здание весовой** (24,3 кв. м, 500/С-54019), **административно-хоз. корпус** (2323,4 кв. м, 500/С-49697, составные части: проезды, площадки, подкран. путь, дорожки, подпор. стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница), **склад** (2328,4 кв. м, 500/С-53297), **склады** (895,5 кв. м, 500/С-53808), **склады, гаражи** (453,6 кв. м, 500/С-53897), **склады, администрат. помещения, агрегатные** (563,7 кв. м, 500/С-53846), **инженерный корпус** (3348,6 кв. м, 500/С-46093), **административно-производ. корпус № 4** (19710,5 кв. м, 500/С-53638), **склад** (2193,5 кв. м, 500/D-708019487), **строительный цех** (507,9 кв. м, 500/С-53845), **насосная станция автоматич. пожаротушения** (194,4 кв. м, 500/С-54016), **станция очистки сточных вод** (305,1 кв. м, 500/С-54015), **градирня** (39,1 кв. м, 500/С-55130), **ливневая канализац. сеть** (1077,5 м, 500/С-1029279), **хозяйственно-питьевая водопров. сеть** (973,2 м, 500/С-1029266), **тепловая сеть** (236,7 м, 500/С-1029272). **Иное имущество, входящее в состав лота:** газопровод внутрицеховой (инв. № 12050078), внеш. электроснабжение складского корпуса (инв. № 12020054), внутриплощадочные кабельные сети (инв. № 12020085), токопровод из алюминиевых шин 3-4 корп. (инв. № 12080111), площадка для складирования песка (гравий, инв. № 11010193), склад баллонов с кислородом (инв. № 10020854), склад для хранения баллонов с аммиаком (инв. № 10020280), склад металлический (инструмент) (инв. № 10020810), склад макулатуры (инв. № 10020877), оборудование РП-2 (инв. № 13041173), конденсат. установки (инв. № 13041182, 13040277, 13040260, 13040159, 13040165), трансформатор силовой (инв. № 13041169), ТП (инв. № 13040099, 13040120), комплекты ТП (инв. № 13040082, 13040053, 13040030), комплект. распред. устройство 6КВ (инв. № 13040024), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040188), лифты груз. (инв. № 28240022, 28240013, 28240065, 28240036, 28240059, 28240042), лифт грузопас. (инв. № 28240071), объекты растительности: береза бородавчатая (инв. № 20054010), вишня, 4 шт. (инв. № 20054002), груша (инв. № 20010005), яблоня (инв. № 20054008), липа мелколистная, 3 шт. (инв. № 20054005), газоны, 10 шт. (инв. № 20050404)

Сведения о земельном участке**:* предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га (**срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения) прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0024 га), недвижимых матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,5035 га)

Обременения по лоту № 1: площади зданий частично сданы в аренду. Здания находятся в залоге у банка. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.
На территории лота расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота.
Покупатель одновременно с подписанием договора купли-продажи недвижимости заключает с Продавцом предварительный договор аренды на часть капитального строения, инв. № 500/С-49698 (комната № 4 (подстанция) 33,6 кв. м, и комната № 5 (подстанция) 52,0 кв. м). Договор аренды Покупатель обязуется заключить с Продавцом в течение 2-х рабочих дней с момента перехода права собственности на объект недвижимости. С предварительным договором о заключении договора аренды части капитального строения можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by.
В соответствии с градостроит. проектом детального планирования, на зем. участках, на которых расположены предметы аукциона, предусмотрено размещение объектов торгово-развлекат., выставочно-музейного, музейно-просветит. назначения

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 36 922 723,27 бел. руб.

ЛОТ № 2

Котельная в составе: **технологическая котельная** (здание специализир. иного назначения, инв. № 500/С-53824, 200,3 кв. м), **хозяйственно-бытовая канализационная сеть** (сооружение специализир. коммун. хозяйства, инв. № 500/С-1029277, 169,0 м), **хозяйственно-питьевая водопроводная сеть** (сооружение специализир. коммун. хозяйства, инв. № 500/С-1029269, 68,4 м). ***Сведения о земельном участке**:* предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве долевой аренды (срок действия: по 31.03.2026) – доля: 71/1250 от об. пл. 1,7459 га

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 127 749,38 бел. руб.

Задаток 1 % по лоту № 1 и 10 % по лоту № 2 от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**30 (тридцать) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

Победитель аукциона, либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,12 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона: 21.06.2024 в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1607, ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Дата и время окончания приема документов: 20.06.2024 до 17.00 по тому же адресу

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29 154-34-35. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ АУКЦИОНА

Организатор аукциона, аукционист	ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by
Собственник имущества	ОДО «ЛИК-ПАРК», УНП 391279139, 220062, г. Минск, пр-т Победителей, д. 141-59, пом. 82
Продавец	Ликвидатор ООО «Правовая компания «АльтЮрКом», УНП 191343750, 220099, г. Минск, ул. Казинца, д. 11А, оф. Б813

Предмет аукциона

№	Наименование	Начальная цена, бел. руб. без НДС
1	**Полуприцеп фургон тентовый WIELTON NS 3S**	41 100,00

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия и порядок проведения аукциона, информация об имуществе размещены в открытом доступе на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 5 (пяти) рабочих дней после аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней после аукциона. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

Аукцион проводится в соответствии с Регламентом организации и проведения публичных торгов в форме аукциона по реализации имущества и имущественных прав ООО «Индустрия Инноваций», размещенном по адресу: https://iin.by

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену предмета аукциона на 5 %, обязан возместить организатору аукциона затраты на их проведение и оплатить аукционисту вознаграждение в размере **3 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит до 100 тыс. белорусских рублей, 2 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит от 100 тыс. до 500 тыс. белорусских рублей в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона

Дата и время проведения аукцион: 19.06.2024, начало аукциона: 10.00, окончание аукциона: 16.00, по адресу: 220002, г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Заявки на участие в аукционе принимаются с 18.05.2024 по 18.06.2024 г. до 16.00

Контактные данные	**Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by**

«КУЛЬТУРЫ ПАТРЭБНЫ ПРЫТОК НОВЫХ ЛЮДЗЕЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Трэба ўлічваць і тое, што рынак працы таксама мяняецца, і мы павінны на гэтыя змены рэагаваць, каб рыхтаваць спецыялістаў на перспектыву. Мы традыцыйна рыхтуем, напрыклад, бібліятэкараў — ёсць спецыяльнасць «Бібліятэчная інфармацыйная дзейнасць». Але ўжо трэці год на гэтую спецыяльнасць ідзе набор па прафілізацыях «Лічбавізацыя» і «Аналітыка», а гэта іншыя навучальныя дысцыпліны, іншы падыход.

Мы робім усё для таго, каб задаволіць кадрамі нашу галіну, але па колькасці заявак, якія былі на аднаго выпускніка падчас размеркавання, мы разумеем, што ўсіх не задавальняем. Бо ёсць спецыяльнасці, па якіх 10 заявак на аднаго чалавека!

З аднаго боку, гэта радуе. А з іншага боку, хтосьці застанецца без выпускніка. Вельмі важна разумець, што ў першую чаргу атрымаюць спецыялістаў арганізацыі, якія паклапаціліся загадзя (пяць ці чатыры гады таму) і замовілі падрыхтоўку спецыялістаў па дагаворы. На мой погляд, падрыхтоўка кадраў — гэта клопат не толькі ВНУ. Гэта клопат усіх суб'ектаў, якія працуюць у сферы, нават да таго, што павінен закладвацца пэўны дзяржаўны адукацыйны стандарт на аснове стандартаў прафесійных, а гэта павінны падказваць установы культуры. І мы актыўна далучаем арганізацыі, якія становяцца заказчыкамі кадраў, або іх прадстаўнікоў. Яны павінны агучваць, якіх кампетэнцый ім хацелася б. Дзеля справядлівасці павінна адзначыць, што на гэты заклік адгукаюцца. Цяпер па даручэнні Прэзідэнта пераглядаюцца ўсе праграмы, таму ў нас па кожнай спецыяльнасці створаны групы з прыцягненнем прафесіяналаў з арганізацый-заказчыкаў, якія аналізуюць не толькі навучальны план, але і кожную праграму: ці патрэбны ў ёй тыя ці іншыя тэмы.

— Гэты рынак трэба ўвесь час маніторыць, каб разумець, колькі першакурснікаў прымаць на якую спецыяльнасць?

— Рынак працы маніторым і актыўна працуем з атрыманымі дадзенымі і арганізацыямі культуры. У нас шмат дагавораў аб узаемадзеянні. Мы добра ведаем не толькі пра сітуацыю ў сталічных установах, але і ў тых, якія знаходзяцца па-за межамі Мінскай кальцавой. Кантрольныя лічбы прыёму фарміруюцца зыходзячы з тых замоў, якія ў нас ёсць. Гэта не прэрагатыва кіраўніцтва ўніверсітэта — вырашаць, колькі набіраць харэаграфаў ці рэжысёраў. Рыхтуем пад патрэбы сферы: ёсць замовы — і мы прымаем на вучобу. Няма замовы —- ніхто бюджэтныя грошы на гэта траціць не будзе. Натуральна, мы сочым за тым, як развіваецца сфера культуры, таму што ў нас ёсць Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, і яны звязаны непасрэдна з арганізацыямі, вядуць улік клубных устаноў, бібліятэк...

Мы аналізуем, якія патрэбны кадры. Дапусцім, бачым, што бракуе артыстаў, якія спяваюць, — і аднаўляем іх падрыхтоўку. У гэтым годзе будзе набор будучых артыстаў мюзіклаў — вельмі невялікі, але яны запатрабаваныя і ў Музычным тэатры, і ў Маладзёжным тэатры эстрады. На мой погляд, культуры патрэбны прыток новых людзей, яшчэ і таму, што адбываецца змена пакаленняў.

— Многія становяцца студэнтамі пасля сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Ці лягчэй ім вучыцца?

— Для тых, хто прыйшоў пасля каледжаў, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, па некалькіх спецыяльнасцях прадугледжана магчымасць атрымліваць адукацыю ў скарочаныя тэрміны, гэта так званыя інтэграваныя праграмы. Так арганізацыі хутчэй атрымаюць гатовых спецыялістаў. Мы перайшлі ўжо з пяцігадовага на чатырохгадовы тэрмін навучання, а выпускнікі каледжаў навучаюцца ў нас па інтэграваных праграмах тры гады. Гэта патрабаванне часу, адукацыйны працэс інтэнсіфікаваўся, але студэнты паспяваюць атрымаць усе неабходныя кампетэнцыі. Падзяка каледжам за іх працу! Бо са студэнтамі, у якіх за плячыма спецыялізаваны каледж, прасцей працаваць: яны свядома ідуць у прафесію і ў нас працягваюць атрымліваць кампетэнцыі на больш высокім узроўні. Гэта адны з найлепшых студэнтаў, якія ў нас вучацца.

— У асобасным плане яны адрозніваюцца ад тых, хто паступае пасля школы?

— Не бачу вялікай розніцы. Ёсць тыя, якія прыходзяць пасля школы, але становяцца вельмі паспяховымі студэнтамі. Насамрэч дзеці, якія паступаюць пасля школы, таксама маглі атрымаць творчую падрыхтоўку. Магчыма, удзельнічалі ў калектыве мастацкай творчасці высокага ўзроўню. Напрыклад, у Магілёве ёсць студыя эстраднага вакалу, дзе займалася Ірына Дарафеева і многія зоркі эстрады. Падрыхтоўка там добрая, але гэта не навучальная ўстанова, і выхаванцы гэтай студыі здаюць іспыты на агульных правах. На творчых спецыяльнасцях у нас няма студэнтаў, якія ўвогуле ніколі і нічому не вучыліся.

У прынцыпе, творчасць — справа калектыўная. Таму студэнты разумеюць, што яны адзін ад аднаго залежаць у добрым сэнсе слова: ёсць пачуццё партнёрства. Калі можна недзе дапамагчы таму ж «школьніку» ці, наадварот, у яго ёсць чаму павучыцца, то чаму б не?

— Ва ўніверсітэт культуры прыходзяць і людзі, якія ўжо сталі зоркамі, напрыклад, былі пераможцы «Славянскага базару»...

— Як правіла, гэта матываваныя і вельмі выхаваныя студэнты, прыемна з імі працаваць. Праўда, цяжкасці могуць узнікнуць на іншым узроўні — з улікам таго, што ў іх ужо ёсць свой канцэртны графік. Але яны з павагай ставяцца да ўніверсітэта і свае магчымыя выступы ўзгадняюць. Калі ўлічыць, што я іх перыядычна бачу не толькі на творчых паказах кафедр, але, напрыклад, і ў сталовай, то разумею, што вучобу не запускаюць. Толькі графік у іх больш шчыльны, улічваючы распачатую кар'еру. Я якраз за тое, каб яе пачынаць як мага раней, а не пасля заканчэння ўніверсітэта. Усё можна сумясціць, калі ўмець планаваць час і мець сур'ёзнае стаўленне да справы.

— У студэнтаў вашай ВНУ ёсць магчымасць творчасці яшчэ падчас вучобы. Нагрузка двайная — вучоба і практыка...

— Даўно заўважылі: чалавек, якому больш дадзена, больш і паспявае. Дзеці, якія заняты ў творчым працэсе, як правіла, вучацца добра. Напрыклад, рыхтуецца прэм'ера ў вучэбным тэатры. Гэта тая занятасць, якая не вызваляе ад асноўнай вучобы, бо стандарты праграмы трэба выконваць. Але навыкі, якія студэнты атрымліваюць такім чынам, дапамагаюць і асноўную праграму засвойваць. Калі яны ў практыцы (нават «на гуку» падчас нейкага мерапрыемства ці на дыскатэках, якія ў нас праводзіць студэнцкі савет ці прафкам), то лепш разумеюць, як арганізавана мерапрыемства. Так прасцей і хутчэй засвоіць тое, пра што гавораць на лекцыі. Калі, як не ў 18, 19, 20 гадоў, гэтым займацца?

— Творчыя работы студэнтаў бываюць даволі прафесійныя. Верагодна, іх можна паказваць гледачам, у тым ліку па квітках?

— У нас ёсць спартыўна-культурны цэнтр, нам не трэба шукаць пляцоўкі, каб прадставіць студэнцкія работы. Па графіку загружанасці СКЦ разумеем: шчасце наступіла! Бо мы не можам часам упісаць дадатковае мерапрыемства, якое трэба арганізаваць: там канцэрт, напрыклад, нейкай кафедры альбо асобнага выканаўцы. Бывае, што адначасова прахадзіць некалькі мерапрыемстваў, і хацелася б усюды пабываць, але гэта фізічна немагчыма. А яшчэ працуе вучэбны тэатр, і яго выхаванцаў запрашаюць выступіць іншыя ўстановы. Спектаклі вывозілі і паказвалі ў Палескім драматычным тэатры і ў Магілёўскім абласным тэатры імя Дуніна-Марцінкевіча. Нашы творчыя калектывы вельмі актыўна ўдзельнічаюць у розных канцэртах, часам самага высокага ўзроўню. Такім чынам, іх бачаць ужо не толькі бацькі і сябры, якія прыходзяць на запрашэнне да нас сюды, а ў тым ліку будучыя абітурыенты або іх сваякі, якія жывуць у той мясцовасці, куды робяцца выезды. І гэта таксама своеасаблівая місія, якая не ўваходзіць непасрэдна ў вучэбны план, але значна пашырае кампетэнцыі будучых спецыялістаў, яны пачынаюць у дэталях разумець, як арганізаваць імпрэзу, выступленне, гастролі...

Квіткі прадаём не заўсёды, а калі разумеем, што гэта рацыянальна. Напрыклад, на канцэрт кафедры харэаграфіі квіткі прадаюцца. Але ёсць праект «Лінія памяці. Код вайны», створаны на грант Прэзідэнта, — на яго паказы квіткі не прадаем, таму што нам важна, каб яго ўбачыла як мага больш людзей. Наогул, наша задача не ў тым, каб зарабіць, а ў тым, каб перш за ўсё паказаць сваю творчасць. Мы ўсё ж не тэатральна-відовішчная ўстанова, якая мае пастановачны план. Але ў гатоўнасці распаўсюджваць квіткі за пэўныя грошы нічога дрэннага не бачу. Радуе, што грошы — далёка не галоўны матыватар у тым, што робяць людзі. Асабліва ў культуры, дзе сваё слова гаворыць захопленасць, жаданне тварыць. Любы чалавек, які прыходзіць у культуру, павінен гэта разумець, інакш не трэба гэтым займацца...

— Тым не менш ёсць тэндэнцыя, што культура павінна вучыцца зарабляць.

— Універсітэт культуры нядрэнна зарабляе. Умовы, якія створаны тут (не толькі матэрыяльна-тэхнічныя) намаганнямі дзяржавы, бюджэтным асігнаваннем, падмацоўваюцца тым, што ўкладвае сам універсітэт, атрымліваючы даходы ад пазабюджэтнай дзейнасці. Гэта тое ж канцэртнае адзенне, афармленне сцэны, светлавыя прыборы і іншыя выдаткі, якія не прадугледжаны ў бюджэце, у тым ліку дадатковыя рамонты ў інтэрнаце...

Напрыклад, рыхтуецца выступаць харэаграфічны калектыў — касцюмы абыходзяцца дорага, асабліва народныя. А калі ў нас калектывы маюць вялікі склад удзельнікаў, то выдаткі немаленькія. Калі яны ўдзельнічаюць у мерапрыемствах, дзе можна зарабіць, сродкі пералічваюцца на рахунак, і калектывы могуць гэтыя грошы выдаткаваць: паехаць, напрыклад, на міжнародны фестываль, калі іх запрасілі і трэба аплаціць дарогу (часцей за ўсё гэта самая вялікая частка выдаткаў). Нешта можа дадаць універсітэт.

— Напэўна, ёсць спецыяльнасці, якія ў большай ступені патрабуюць дадатковай рэкламы, каб прыцягваць абітурыентаў?

— Прафарыентацыі мы ўдзяляем вельмі вялікую ўвагу. Вынікам будзе ўступная кампанія. Мы правялі за год велізарную колькасць мерапрыемстваў у разліку на будучых абітурыентаў, толькі дзён адчыненых дзвярэй было больш за дваццаць. Дзякуй вялікі Міністэрству культуры, што нас падтрымала ў правядзенні выязных комплексных мерапрыемстваў: прадстаўнікі ўніверсітэта наведалі 16 населеных пунктаў у розных рэгіёнах — з творчымі паказамі, з расповедамі пра спецыяльнасці, на якія можна паступіць. Акрамя таго, нашы выкладчыкі часта бываюць у журы конкурсаў ці дзяржаўных іспытаў і расказваюць пра ўніверсітэт. Бываюць выезды прадстаўнікоў кафедраў па запыце раёнаў, каб расказалі, як паступіць, і пра тое, кім выпускнікі будуць потым працаваць. Можна атрымаць нават індывідуальную кансультацыю наконт паступлення.

У нас няма недабораў, і конкурс забяспечваецца даволі высокі. Калі я кажу, што не вельмі задаволеная, то толькі таму, што памятаю часы, калі было сем, восем, дзевяць чалавек на месца... І мы робім усё магчымае, каб адабраць самых лепшых, самых матываваных.

— Гэтыя спецыялісты вельмі запатрабаваныя і цяпер, напрыклад, бібліятэкары...

— Так, але, магчыма, шмат каму здаецца (і гэта не наша віна), што гэта не вельмі аплачвальная і сумная праца — у бібліятэцы сядзець. Не сядзець! Бібліятэкі сёння — комплексныя ўстановы, якія не толькі кнігі выдаюць. Чаго яны толькі не арганізоўваюць: і квэсты, і паэтычныя клубы, і тэатральныя студыі, і краязнаўчую працу вядуць.

— Адна справа — вучыцца ў цікавым творчым асяроддзі, іншая — потым вярнуцца на радзіму ці паехаць працаваць у глыбінку...

— ...Жыццё не абмяжоўваецца Мінскам, хаця і сталіцы патрэбны кадры. Але як гавораць: умовы гульні зразумелыя на старце. Усе ўсведамляюць, што выдаткі, якія нясе бюджэт на падрыхтоўку любога спецыяліста, вельмі вялікія. І наша ВНУ, у прыватнасці, па затратах у верхніх радках. У нас ёсць групы, дзе шэсць чалавек і ўвогуле вялікая колькасць індывідуальных заняткаў. Чалавек, які паступае сюды, павінен разумець, што гэта не проста так, дзеля яго задавальнення. Ён атрымлівае права стаць спецыялістам па нейкім кірунку, адпаведна, у яго ёсць абавязак адпрацаваць сваё навучанне. Тым больш што сёння Дамы культуры ў многіх рэгіёнах забяспечаны такім абсталяваннем, што нават мы глядзім са здзіўленнем. Уражваюць культурныя цэнтры, якія сёння будуюцца, дзіцячыя школы мастацтваў — некаторыя не горшыя, чым у сталіцы. Можна прыклад прывесці: падчас размеркавання выпускнік — лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі свядома адмаўляецца ад прапановы застацца ў Мінску і просіць накіраваць яго на радзіму — у Нясвіжскі раён (дарэчы, мы ведаем, што гэты хлопец там вельмі добра працуе!). Гэта быў яго свядомы выбар.

У гэтым годзе ў нас было шмат замоў з боку вядучых арганізацый, у тым ліку рэспубліканскага падпарадкавання. Нацыянальная бібліятэка замовіла вельмі шмат выпускнікоў, як і тэатры. Ёсць выпускнікі, якіх жадаюць запрасіць на працу адначасова некалькі ўстаноў. Канешне, калі чалавек добра вучыўся, то ён мае права пайсці туды, дзе яму будзе больш цікава.

Тэма кадраў сапраўды актуальная, і мы робім усё для таго, каб забяспечыць імі арганізацыі культуры. Ёсць яшчэ над чым працаваць, нават з улікам таго, што кожны год стапрацэнтнае размеркаванне на бюджэтнай форме навучання. Акрамя таго, просяць аб размеркаванні некаторыя выпускнікі, якія вучацца на платнай аснове.

— Дзеці лічбавай эпохі, напэўна, іншыя. Ці адчуваюць выкладчыкі гэтыя змены?

— Час, калі выкладчык заходзіў у аўдыторыю і быў адзінай крыніцай ведаў, мінуў. Выкладчыкам сёння трэба будаваць сваю работу інакш. Мы перыядычна праводзім маніторынгі задаволенасці студэнтаў. Вывучаем гэтыя паказчыкі і праз некаторы час: выпускнікі запаўняюць спецыяльныя формы. Я лічу, што пры тым патоку інфармацыі, які ёсць сёння, многія падыходы састарэлі і трэба перабудоўвацца. Я разумею гэта па тым, што гавораць студэнты на сустрэчах (у тым ліку нефармальных). Яны не скардзяцца на састарэлую інфармацыю, якая даносіцца сумна і несучасна. Цешыць, што дзеці самі падказваюць, якія дысцыпліны яны хацелі б засвоіць раней, чым гэта прадугледжана вучэбным планам, бо разумеюць, што ў практычнай дзейнасці спатрэбіцца. І калі мы бачым, што гэта абгрунтавана, то карэкціруем вучэбны план. Навучальная дакументацыя, у тым ліку праграмная, павінна абнаўляцца ўвесь час. І калі недзе можна прымяніць найноўшыя тэхналогіі, то гэта трэба рабіць. Трэба вучыць арыентавацца ў інфармацыйным патоку, таму што раней быў адзін падручнік, які дастаткова было прачытаць, а цяпер з розных крыніц могуць даносіць абсалютна розную інфармацыю, якая можа быць як сапраўднай, так і лжывай... Але ёсць традыцыі, без якіх таксама немагчыма. Напрыклад, у выканальніцкіх школах закладзены асновы майстэрства — гэтага не змяніць. Тут патрэбны настаўнік — спецыяліст, які навучыць, паправіць. Але галоўнае, што педагог любой дысцыпліны фарміруе светапогляд: каб чалавек разумеў, дзеля чаго ён нешта робіць.

Ларыса ЦІМОШЫК

«Пласт роднай зямлі — п'едэстал для паэта...»

Гутарка з дырэктарам Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Ганнай Галінскай да юбілею музея

«Дом пад таполяй»... Менавіта так называлі дом Івана Дамінікавіча Луцэвіча, Янкі Купалы — гасціннае месца, дзе заўсёды гучалі вершы і цікавыя размовы, а гаспадыня, Уладзіслава Францаўна Луцэвіч, Купаліха, кожнага запрашала за стол.

У вайну дом быў знішчаны. Купала трагічна загінуў у 1942-м у Маскве... А Купаліха яшчэ да вяртання ў родную Беларусь пачала клапаціцца пра захаванне памяці мужа. І 19 мая 1944 года з'яўляецца пастанова Савета народных камісараў БССР аб стварэнні музея народнага паэта, першым дырэктарам якога і стала Уладзіслава Францаўна.

У гэтым годзе музей беларускага Песняра святкуе свой юбілей. За гэты час ад сціплай экспазіцыі ў пакоях былога Дома прафсаюзаў музей ператварыўся ў цэлы музейны комплекс... Пра сёння Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы і яго юбілей мы гутарым з дырэктарам Ганнай Галінскай.

— Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы сёння мае ў сваім складзе не толькі музей у Мінску, але і чатыры філіялы, — распавядае пра свае «гаспадаркі» Ганна Васільеўна. — Найстарэйшы — «Вязынка», радзіма паэта, якая прыняла першых гасцей у 1948 годзе. Заснаваны гэты філіял быў у 1945-м, тады ж заснаваны і філіял «Ляўкі» на Аршаншчыне, на тым месцы, дзе ў 1936—1941 гадах на стромым беразе Дняпра стаяла дача паэта. Сёння «Вязынка» і «Ляўкі» — Купалаўскія мемарыяльныя запаведнікі, унесеныя ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. У 1989 годзе на маляўнічай Лагойшчыне з'явіўся трэці філіял «Акопы», адкрыццё якога адбылося на 110-я ўгодкі з дня нараджэння Янкі Купалы. Самы малады філіял — «Яхімоўшчына», заснаваная ў 1997 годзе ў вёсцы Яхімоўшчына на Маладзечаншчыне, дзе ў 1906—1907 гадах працаваў на бровары Янка Купала. Адкрыццё адбылося ў 2001 годзе. Сёння экспазіцыі ў Вязынцы, Ляўках і Акопах абноўлены, у перспектыве — стварэнне новай экспазіцыі ў Яхімоўшчыне.

Штогод музей і філіялы наведваюць дзясяткі тысяч людзей, сярод якіх не толькі беларусы, але і госці нашай краіны. Гаспадарка даволі вялікая. Толькі Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка» займае каля 14 га. І задача не толькі ва ўтрыманні ў належным стане экспазіцый, будынкаў, аб'ектаў, але і тэрыторый філіялаў. У гэтым дапамагаюць супрацоўнікі філіялаў. Большасць з іх — мясцовыя жыхары, якія беражліва адносяцца да родных мясцін і з павагай да спадчыны народнага паэта. Я адчуваю гэта, калі прыязджаю да іх. Стараюся як мага часцей, бо не ўсе пытанні можна вырашыць па тэлефоне.

— Музей Янкі Купалы — гэта яшчэ і навуковая ўстанова, але навуковая праца звычайна застаецца «за кулісамі» для звычайных наведнікаў музея. Як яна сёння вядзецца?

— Літаратурны музей Янкі Купалы ствараўся як структурная адзінка Акадэміі навук БССР і ад пачатку існавання выконваў функцыю цэнтра па зборы, захоўванні, вывучэнні і папулярызацыі купалаўскай спадчыны. Сучасны музей працягвае традыцыі, закладзеныя яшчэ Уладзіславай Францаўнай. Праводзім міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Купалаўскія чытанні», 14-я чытанні прайшлі ў 2022 годзе і былі прысвечаны 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і 100-годдзю зборніка «Спадчына». У сваю чаргу, супрацоўнікі музея бяруць удзел у навуковых канферэнцыях і семінарах, дзе асвятляюць пытанні як у галіне гісторыі беларускага мастацкага слова, так і сферы музеязнаўства. Яны рыхтуюць навукова-папулярныя і навуковыя артыкулы, якія публікуюцца ў СМІ. Сёлетні чацвёрты нумар часопіса «Роднае слова» прысвечаны юбілею музея і ў значнай ступені падрыхтаваны музейнымі супрацоўнікамі. Работа па вывучэнні музейных фондаў знайшла адбітак у шэрагу выданняў, сярод іх — ілюстраваны каталог фатаграфій У. Ф. Луцэвіч «На добры ўспамін» (2016), ілюстраваны каталог «Афішы да спектакля «Паўлінка» па аднайменнай п'есе Янкі Купалы» (2014), ілюстраваны каталог калекцыі «Мастацтва» «Янка Купала. Я адплацію народу, чым моц мая магла...» (2019). Музеем падрыхтавана двухмоўнае ілюстраванае выданне ўнікальнай манаграфіі Льва Клейнбарта «Сустрэчы. Янка Купала» (2021), якая захоўвалася ў музейным зборы і раней не публікавалася.

— У музея Янкі Купалы ёсць шмат праектаў, якія сталі ўжо традыцыйнымі, напрыклад, фестываль паэзіі ў Вязынцы...

— Так, адзін з нашых традыцыйных і, напэўна, самых сталых праектаў — Рэспубліканскае свята паэзіі, песні і народных рамёстваў «З адною думкаю аб шчасці Беларусі», якое ладзіцца на тэрыторыі Купалаўскага мемарыяльнага запаведніка «Вязынка» сумесна з Маладзечанскім райвыканкамам і Саюзам пісьменнікаў Беларусі. З 1972 года кожнае лета ў пачатку ліпеня Вязынка збірае сяброў, каб адсвяткаваць дзень нараджэння Янкі Купалы. А яшчэ больш чым дзясятак гадоў мы рэалізуем культурна-асветніцкі праект «Музыка ў музеі» сумесна з выкладчыкамі і студэнтамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Яшчэ адным доўгатэрміновым праектам (каля 10 гадоў), які ладзіцца сумесна з выкладчыкамі і студэнтамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, з'яўляецца культурна-адукацыйны праект «Паэзія без межаў» з удзелам студэнтаў з Кітайскай Народнай Рэспублікі. Менавіта ў Пекіне ў 1957 годзе да дня нараджэння Янкі Купалы адбылася першая міжнародная выстаўка, прысвечаная юбілею паэта. Верш «А хто там ідзе» і многія іншыя творы Купалы друкаваліся ў перакладах на кітайскую мову. У межах гэтага праекта кітайскія студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі чытаюць вершы беларускага народнага паэта на кітайскай мове.

Грамадска-культурная акцыя «Чытаем Купалу разам» ладзіцца з 2012 года. Распрацаваны макет паштовак з вершамі паэта ў перакладах на 85 моў. Новы культурна-адукацыйны праект «Скарбонка талентаў» прыменкаваны да 80-годдзя музея Янкі Купалы. Мы прапануем нашым гасцям паглыбіцца ў творчы свет паэта і адкрыць уласныя здольнасці з дапамогай майстар-класаў па асваенні тэхнікі арыгамі, саломапляцення, лозапляцення, вырабу ўпрыгожанняў і інш.

У красавіку мы падвялі вынікі Мінскага гарадскога конкурсу відэаролікаў «#ЛЮБЛЮМУЗЕЙ», прымеркаванага да 80-годдзя музея Купалы. Конкурс праводзіўся сярод вучняў 1—11 класаў сярэдніх школ і гімназій Мінска, было дасланы 48 відэаролікаў.

— Каля вытокаў музея стаяла жонка Янкі Купалы, Уладзіслава Францаўна Луцэвіч, яна ж была і першым дырэктарам. Якой вы асабіста ўяўляеце Уладзіславу Францаўну, гэтую вельмі неардынарную асобу, пра якую пакінута столькі розных меркаванняў сучаснікаў?

— Яна для мяне прыклад. Па-першае, сапраўднай жанчыны, вернай і самаадданай, якая заўсёды падтрымлівала свайго таленавітага мужа, раздзяляла яго погляды, забяспечвала яго быт, была сапраўднай гаспадыняй Купалавага дома. Па-другое, Уладзіслава Францаўна — выдатны і справядлівы арганізатар і кіраўнік. Нягледзячы на цяжкасці і страты, яна знайшла ў сабе сілы не толькі шмат зрабіць для ўшанавання памяці Янкі Купалы, але і, не маючы спецыяльнай адукацыі, стварыць музей з моманту камплектавання фондаў да адкрыцця экспазіцыі. Сёлета да 8 сакавіка зладжаны праект «Гаспадыня Купалавага Дому», таксама Уладзіслава Францаўна Луцэвіч стане галоўнай гераіняй юбілейнага праекта «Купалаў Дом — 80!».

— Як вядома, Янка Купала адным з першых адгукнуўся палымяным паэтычным словам на пачатак Вялікай Айчыннай вайны, заклікаючы на барацьбу супраць захопнікаў. Як музей удзельнічае ў святкаванні 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў?

— Да 22 чэрвеня — Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа — у сацыяльных сетках музея будзе размешчана віртуальная выстаўка «Цень забітых...» (назва з верша «Беларускім партызанам»), а ў музеі на базе выстаўкі «Клічу вас я на пабеду...» пройдзе культурна-патрыятычная акцыя «Гавару табе шчырае слова...». Усе гэтыя праекты знаёмяць з творчай спадчынай Янкі Купалы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Да 3 ліпеня прымеркавана экспанаванне ў Купалаўскім мемарыяльным запаведніку «Ляўкі» перасоўнай выставы «Тут усякая рэч як гавора з табой...», прысвечанай жыццю і творчасці Янкі Купалы ў эвакуацыі ў Татарстане. 9 мая мы традыцыйна далучыліся да Рэспубліканскага культурна-патрыятычнага мерапрыемства «Ніхто не забыты, нішто не забыта». Падчас грамадска-культурнай акцыі «Чытаем Купалу разам» наведнікі чыталі вершы і артыкулы паэта, напісаныя ў 1941—1944 гадах. У межах акцыі 22 чэрвеня запланавана і культурна-патрыятычнае мерапрыемства «Гавару табе шчырае слова...», прысвечанае 80-годдзю вызвалення Беларусі. 3 ліпеня, калі краіна будзе святкаваць Дзень Незалежнасці, мы прапануем інтэрактыўныя экскурсіі па выставе «Мінскія гісторыі Янкі Купалы».

